**Уладзімір Караткевіч. Энцыклапедычны даведнік. Беларуская энцыклапедыя імя Петруся Броўкі, 2020**



БАСАЛЫГА

М.**Басалыга**. *Ілюстрацыя да аповесці «Дзікае паляванне караля Стаха» У.Караткевіча. 2007.*

Сафіі Полацкай», «На краю поля Кулікова», «Тадэвуш Касцюшка» (усе 2000), партрэты «Рагнеда» (1990), «Давыд Гарадзенскі» (1993), «Л.Сапега» (1994), «Настасся Слуцкая», «Усяслаў Чарадзей» (абодва 2004) і інш., серыя работ «Айчыну сваю баронячы» (1992) і інш.

Выканаў іл. да кніг К. «Дзікае паляванне караля Стаха» (2007), «Хрыстос прызямліўся ў Гародні» (2017), станковы ліст паводле твора «Ладдзя роспачы» (2010).

*Г.А.Фатыхава.*

**БАСАЛЫ́ГА** Уладзімір Самойлавіч (1940—2020), беларускі графік. Скончыў Бел. тэатр.-маст. ін-т (1967), у 1990—99 выкладаў у ім. З 1967 гал. мастак Упраўлення маст. прамысловасці, у 1971—80 — Маст. фонду Беларусі. Працаваў у галіне кніжнай і станковай графікі, экслібрыса, дэкар.-прыкладнога мастацтва. Аўтар серыі літаграфій «Шануйце роднае слова» (1976), «Помнікі дойлідства Беларусі» (1977—2009), «Неба Бацькаўшчыны», «Неба Айчыны» (абедзве 1980), цыклаў «Песні працавітасці» (1976), «Пакутніцы духоўнага Чарнобыля» (1996) і інш.

Аформіў паэт. зб. «Мая Іліяда» К. (1969, папера, акварэль, туш). Вастрыня і дынамізм, унутр. напружанасць паэзіі К. натхнілі мастака на пошук новых вобразаў і сродкаў выразнасці. Для малюнкаў характэрны паэтычнасць, абагуленасць. Б. асабіста паказваў К. малюнкі да кнігі і атрымаў яго згоду на ілюстраванне.

*Г.А.Фатыхава.*

У.**Басалыга**. *Ілюстрацыі да зборніка «Мая Іліяда» У.Караткевіча. 1969.*

40

Пад адной вокладкай — каля тысячы артыкулаў, датычных жыцця і творчасці пісьменніка. Матэрыялы пра блізкіх і родных, пра тых, хто меў з ім стасункі, хто даследаваў і даследуе яго літаратурную дзейнасць, а таксама пра тых, для каго постаць Караткевіча — крыніца натхнення. Тут жа — літаратуразнаўчыя артыкулы па раманах, аповесцях, найбольш значных нарысах. Падрабязна разглядаюцца мастацкія сродкі, якія выкарыстоўваў пісьменнік. На старонках знайшлося месца такім артыкулам, як «Друк і У. Караткевіч», «Радыё і У. Караткевіч». Апісаны месцы, дзе ён бываў, сустракаўся з сябрамі, натхняўся на новыя творы. Увогуле, гэты энцыклапедычны даведнік — першы крок, трывалая прыступка да стварэння паўнавартаснай энцыклапедыі «Уладзімір Караткевіч», якая, магчыма, з'явіцца да наступнага юбілею. Шматлікія артыкулы выдання могуць быць карыснымі для студэнтаў пры напісанні курсавых работ. Ды і школьныя настаўнікі знойдуць шмат інфармацыі для падрыхтоўкі ўрокаў, і вучні атрымаюць яшчэ больш магчымасцей для высокіх адзнак.

На ніве караткевічазнаўства ёсць яшчэ да канца не распрацаваныя тэмы, гэта багатая глеба для маладых спецыялістаў. Навіна аб падрыхтоўцы энцыклапедычнага даведніка выклікала зацікаўленасць навукоўцаў устаноў вышэйшай адукацыі — у яго падрыхтоўку ўключыліся выкладчыкі амаль усіх так званых класічных, а таксама педагагічных універсітэтаў краіны. Шэраг артыкулаў падрыхтаваны супрацоўнікамі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва, музея Уладзіміра Караткевіча ў Оршы, а таксама выдавецтва «Беларуская энцыклапедыя імя Петруся Броўкі». Сярод аўтараў — навукоўцы, даследчыкі жыцця і творчасці Караткевіча, журналісты і краязнаўцы. Вялікую дапамогу ў падрыхтоўцы слоўніка энцыклапедычнага даведніка аказалі супрацоўнікі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі.

Па старой традыцыі і зыходзячы з патрабаванняў часу ў даведніку змешчана шмат ілюстрацый. Гэта фотаздымкі, якія захоўваюцца ў архівах Беларусі і ў асабістых архівах аўтараў, рэпрадукцыі жывапісных і графічных работ, прысвечаных Караткевічу, звязаных з мясцінамі, дзе ён бываў.

Такое выданне — шчырая падзяка класіку беларускай літаратуры, творчасць якога, як зазначыў у свой час А. Адамовіч, запоўніла «прорву паміж дзіцячай, нават маладзёжнай аўдыторыяй і літаратурай для дарослых» і які сам «заняўся сур'ёзна тым, што зрабіў у Англіі Вальтэр Скот, у Расіі Лажэчнікаў і Загоскін».

*Вольга Давідовіч*